УДК 340.132(091)

## ХАРАКТАР ПАРУШЭННЯЎ У ДАЧНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ Ў БССР

*Лубінскі Іван Іванавіч*
старшы выкладчык кафедры філасофіі і паліталогіі
Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта
(г. Мінск, Беларусь)

*Дачны рух у БССР меў шэраг парушэнняў савецкага заканадаўства. Грамадзяне парушалі нормы савецкага права, статутаў садоўніцкіх таварыстваў, карысталіся сваім службовым становішчам.*

Савецкі лад жыцця прадугледжваў захаванне як заканадаўства, так і сацыялістычных норм. Аднак зразумела, што ў ніводным грамадстве не абыходзіцца без парушэнняў прынятых правілаў. І БССР не выключэнне. Адна са сфер жыцця, якая проста не магла абысціся без парушэнняў "сацыялістычнай законнасці", была зямельная справа. А дачныя таварыствы, якія з'явіліся ў БССР у канцы 1950-х гг., вельмі хутка сталі не толькі папулярнымі месцамі адпачынку, але і аб'ектам незаконнай дзейнасці.

Гэта тэма мала разглядалася ў літаратуры, хаця існуе шэраг архіўных дакументаў, дзе зафіксаваны парушэнні ў развіцці дачнай справы ў БССР [4; 7]. Гэтыя запіскі адлюстравалі актыўнасць парушальнікаў, нават зацятасць парушэнняў.

Трэба адзначыць, што само зямельнае пытанне ў савецкім сацыялістычным ладзе было зведзена толькі да магчымасці карыстацца зямлёю, бо права на валоданне ёю належала толькі дзяржаве. Гэта павінна было знізіць апетыты землекарыстальнікаў, аднак часам атрымоўвалася наадварот. Такі стан рэчаў ярка ілюструе дачны рух, які быў рэдкай, калі не адзінай магчымасцю для гараджан атрымаць кавалак зямлі, выкарыстоўваць яго ва ўласных патрэбах. Гэтая матэрыяльная зацікаўленасць і прыводзіла да масавых парушэнняў у атрыманні і валоданні дачнымі надзеламі.

Ужо ў першыя гады развіцця садоўніцкіх таварыстваў стала заўважнай тэндэнцыя атрымання пад дачы не столькі няўдобіц ці неапрацаваных зямель каля гарадоў, як гэта прадугледжвала заканадаўства [2; 8], аднак даволі добрых кавалкаў ворнай зямлі калгасаў і саўгасаў. Так, у запісцы аб адвядзенні зямель для калектыўнага саду работнікам МТЗ з зямель калгаса "Перамога" і ў рашэнні Мінрайвыканкама № 403 ад 29.10.1958 г. па гэтым пытанні, спасылаючыся на пастанову Савета Міністраў СССР ад 22 чэрвеня 1954 г. "О порядке рассмотрения вопросов об отводе земель для государственных, общественных и других надобностей" [2], ідзе размова пра 53 га ворнай зямлі калгаса, што перавышае магчымы ліміт больш чым у 2 разы [1; 3]. Зразумела, што сацыяльны аспект у такіх выпадках пераважаў над юрыдычнымі абмежаваннямі, бо МТЗ як флагмана беларускай прамысловасці з велізарным калектывам працоўных трэба было падтрымоўваць і аберагаць. Непрыемным жа і прыкрым з'яўляецца той факт, што, забраўшы землі ў сялян пад стварэнне калгасаў яшчэ ў 1930-я гг. у многім дзеля падтрымкі індустрыялізацыі, савецкія ўлады ўжо ў 1950-я пачалі іх раздаваць гараджанам. Хоць гэта і выглядала падачкай – усяго 6 сотак, аднак выкарыстоўвалася зямля гарадскімі жыхарамі практычна так, як і раней сялянамі, – пракарміць сям'ю, але з парушэннямі законнасці.

Такія выпадкі характэрныя і для іншых таварыстваў садаводаў-аматараў. і ў 1980-х гг. гэта праблема не была вырашана. У той час землі сельскагаспадарчага прызначэння таварыствам дазвалялася выдзяляць, аднак толькі ў надзвычайным выпадку [6, л. 91]. У Мінскай вобласці такое парушэнне выяўлена пры праектаванні таварыстваў для работнікаў цэнтральных дзяржаўных органаў улады і грамадскіх аб'яднанняў: Мінфіна, Дзяржплана, Міністэрства сувязі, Саюза пісьменнікаў. Прычым з 27,7 га плошчы таварыстваў 26,5 га – землі сельгаспрызначэння. Такія парушэнні ёсць у іншых таварыствах Мінскай вобласці, а на Гродзеншчыне ў гэтым былі заўважаны адказныя асобы з Гродзенскага абкама партыі [7, л. 78]. Так адбывалася новае пераразмеркаванне зямель прыгарадных калгасаў і саўгасаў з утварэннем на іх новых, ужо сацыялістычных "вёсак" дачнікаў. А сёння актыўна абмяркоўваецца магчымасць пераводу гэтых летніх пасёлкаў у статус населеных пунктаў [5]. Гэта, аднак, сведчыць пра тое, што вёска ў нашым урбанізаваным грамадстве (хоць і праз падобнае перараджэнне) здольная захавацца.

У пастанове Савета Міністраў БССР № 431 ад 13 ліпеня 1957 г. дазвалялася будаваць на надзелах дамкі дачнага тыпу, а кіраўніцтва прадпрыемстваў і арганізацый абавязвалася аказваць пры гэтым будаўніцтве неабходную дапамогу [9, с. 562]. Гэтыя абставіны рабілі атрыманне дачнага надзелу не толькі карысным для сямейнай гаспадаркі, але і своеасаблівым загарадным жыллём. Далейшыя савецкія пастановы, якія ўводзілі сур'ёзныя абмежаванні на памеры і характар дачных пабудоў, не спынілі будаўніцтва. Парушэнні ж былі звязаныя з памерам пабудоў. Калі у 1950-х гг. пра гэта гаварылася агулам [4, л. 339], то ў канцы 1970-х – пачатку 1980-х у дакументах ужо фігуруюць і лічбы, і прозвішчы, і арганізацыі. Ішлі парушэнні тыпавых праектаў – будаўніцтва недазволеных заканадаўствам дач з гаражамі і іншымі гаспадарчымі пабудовамі. Так, у садовым таварыстве з 108 дамкоў па тыпавым праекце толькі 10 магло быць пабудавана. Памочнік пракурора Магілёўскай вобласці меў памеры дачнага доміка 76 кв. м., што больш чым удвая перавышала дазволеную плошчу [7, л. 78].

Тая ж запіска 1982 г. фіксуе і іншыя парушэнні "дачнага заканадаўства". Выключна незаконным дзеяннем было ўзводзіць пабудовы за межамі адведзеных для таварыства зямель. І ў гэтым быў заўважаны памочнік пракурора з г. Гродна, які пабудаваў дом у таварыстве пры ўпраўленні капітальнага будаўніцтва Гродзенскага аблвыканкама (што ўжо было не вельмі добра, бо пры пракуратуры было сваё таварыства) на землях калгаса. Такія парушэнні здзяйснялі некаторыя прарабы і нават дырэктар птушкафабрыкі [7, л. 78]. Такім чынам, адказныя асобы, карыстаючыся сваім службовым становішчам, дзейнічалі выключна ва ўласных інтарэсах.

Сур'ёзным парушэннем было выкарыстанне матэрыялаў, якія належалі дзяржаўным органам, для будаўніцтва дачных дамкоў. Так, адзін чыноўнік з Магілёўскай вобласці будаваў сабе дачу з матэрыялаў, якія належалі арганізацыям некалькіх раёнаў Магілёўскай вобласці. Зразумела, што падобнае будаўніцтва дачнага дамка звязана з удзелам шматлікіх адказных асоб з гэтых арганізацый. Такі факт адзначаны ў Лоеўскім, Брэсцкім раёнах [7, л. 78-79] і характэрны для ўсёй БССР.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Таксама ў дакуменце праводзіцца аналіз удзелу ў таварыствах розных слаёў насельніцтва і заўважана тэндэнцыя атрымання садовых участкаў пераважна служачымі, работнікамі кіраўнічага апарату, у выніку чаго рабочыя складаюць усяго 40 % ад колькасці ўсіх садаводаў (у Магілёўскай вобласці і г. Мінску – 25,7% і 30,2%). У той самы час чарга жадаючых атрымаць садовы ўчастак толькі ў Брэсцкай вобласці складала 5 тыс. рабочых [7, л. 79].

Яшчэ больш дзіўна выглядаюць парушэнні, звязаныя з юрыдычным афармленнем садоўніцкіх таварыстваў. Так, статут садоўніцкага таварыства Магілёўскага аддзялення Інстытута фізікі Акадэміі навук БССР утрымліваў такія дапаўненні: "членам праўлення садоўніцкага таварыства прадставіць права выбару надзелу", "стварыць непадзельны фонд дырэктара прадпрыемства ў памеры 0,6 га" [7, л. 80]. Гэтыя пункты фіксуюць прывілеяванасць пэўнай групы і асобнага чалавека, а статут зацверджаны юрыдычна. Некаторыя таварыствы ўвогуле дзейнічалі без юрыдычнай рэгістрацыі, г. зн. адбыўся захоп зямлі пэўнымі групамі грамадзян.

Пры наяўнасці такой колькасці парушэнняў і агульным характары некантраляванага працэсу развіцця садоўніцкіх таварыстваў у БССР зусім нязначным з'яўлялася пакаранне парушальнікаў. Так, бюро Гомельскага абкама партыі аб'явіла парушальнікам дачнага заканадаўства строгія партыйныя спагнанні і ўказала на недахопы, а бюро Магілёўскага абкама партыі проста пакрытыкавала дзейнасць аблвыканкама. Падкрэсліваецца, што многія выканаўчыя, партыйныя, прафсаюзныя органы самаўхіляюцца ад кантролю за працай садоўніцкіх таварыстваў, не даюць прынцыповай ацэнкі фактам парушэнняў і злоўжыванняў [7, л. 80].

Такім чынам, дача стала не толькі месцам адпачынку для савецкіх грамадзян, але і спосабам, часам зусім беспакарана, з парушэннем заканадаўства, палепшыць свой побыт. Савецкі чалавек так уцякаў ад абмежаванняў, характэрных для савецкага метаду кіравання грамадствам. На дачы хацелася пабыць свабодным, не зусім савецкім чалавекам, нават калі ты займаў высокую пасаду.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. – Ф. 1343. – Воп. 3. – Спр. 1158. – Л. 326.
2. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. – Ф. 2. – Воп.2. – Спр. 1024. – Л. 152-155.
3. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. – Ф. 2. – Воп. 2. – Спр. 1614а. – Л. 300.
4. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. – Ф. 2. – Воп. 2. – Спр. 1614а. – Л. 339-340.
5. Как садовому товариществу получить статус населенного пункта [Электронный ресурс] // Беларусь сегодня. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/dacha-s-vidom-na-derevnyu.html. – Дата доступа: 18.10.2019
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4п. – Воп. 117. – Спр. 78. – Л. 89-96.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4п. – Воп. 144. – Спр. 74. – Л. 77-80.
8. О коллективном и индивидуальном огородничестве и садоводстве рабочих и служащих [Электронный ресурс] : постановление Совета Министров СССР, 24 февраля 1949 г., № 807 // Библиотека нормативно-правовых актов Союза Советских Социалистических Республик. – Режим доступа: http://libussr.ru/doc_ussr/usr_4736.htm – Дата доступа: 09.10.2019.
9. О типовом уставе садоводческого товарищества рабочих и служащих: Постановление Совета Министров БССР № 431 от 13 июля 1957 г. // Собрание законов, указов Президиума Верховного Совета Белорусской ССР, постановлений и распоряжений Совета Министров Белорусской ССР. – Минск : Министерство юстиции БССР, 1957. – С. 562 – 569.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова